Жыві, Беларусь!

Народная газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№ 230 (243) 27 лістапада 1991 г. Серада.

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1990 ГОДА НА БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ.

Кошт: у розніцу — 10 кап. падпісны — 3 кап.

Факты Аргументы Комментарии Суждения

Нам чужих рублей не надо. Но и своих не отдадим

Правительство Беларуси делает свои выводы из сведений о том, что другие республики вводят собственные деньги.

Теперь граждане других республик, у которых в банках РБ открыты счета, смогут получить свои денежки только по месту жительства. Для этого, как предписано в распоряжении Совмина Беларуси, необходимо написать соответствующее заявление.

Кстати, Национальному и коммерческим банкам РБ дано указание произвести инвентаризацию вкладов КПСС, как сказано в распоряжении Совмина, для «принятия решения о дальнейшем их использовании».

Анатолий ВИКТОРОВ.

Переплюнули таксистов

МИНСК. **Со вчерашнего дня коммерческая цена поллитровки «Столичной» в городе — 80 рублей (у таксистов, как правило, лишь 70 рублей).**

Похоже, городские власти решили всерьез извести очереди за спиртным в коммерческих магазинах, а заодно и потрясти наши кошельки. Дополнительная прибыль (разница между коммерческой и прейскурантной ценой) будет распределяться следующим образом: 80 процентов — в городской бюджет, 10 — производителю, 8 — торговле, 2— милиции.

Юрий НОЯРОВИЧ.

«Прощай, жизнь...»

Еще в апреле минские власти приняли решение об открытии медико-психолого-педагогического центра для оказания помощи подросткам.

К сожалению, восьми юным гражданам она уже никогда не понадобится. Только за последние девять месяцев столько подростков столицы, не дождавшись открытия центра, покончили жизнь самоубийством. Более 100 прибегали к попыткам самоубийств, но их удалось спасти после доставки в больницу скорой помощи. За это время 231 ребенок уходил из дома.

Не пора ли «отцам» города все-таки открыть медико-психолого - педагогический центр?

Иван ПЕТРЯКОВ.

Дешево, но сердито

ВИТЕБСК. **Щедрый подарок сделал главврач Дома ребенка Александр Захаров медсестре поликлиники им. Ленина Ольге Савейко. Он продал ей всего за 3 тысячи «деревянных» свой служебный «Москвич», розничная цена которого во много раз выше.**

Чтобы придать лихой торговой операции законную видимость, машину, которая была на ходу менее четырех лет, списали. Акт об этом был составлен исподтишка, без участия главного бухгалтера и технических специалистов. Вместо них сомнительную бумагу подмахнули две массажистки и нянечка.

Приказ о списании автомобиля с целью продажи его медсестре «учинил» никто иной как заведующий городским отделом здравоохранения Олег Савейко, сын медсестры. То, что «Москвич» понадобился ему, а не семидесятилетней маме, поймет даже воспитанник Дома ребенка...

Сергей БУТКЕВИЧ.

Уроки для американцев

15 юных жителей штата Пенсильвания (США) по приглашению Белорусского комитета защиты мира и Министерства народного образования приехали в Минск, чтобы познакомиться с жизнью белорусских сверстников.

Они живут в семьях своих новых друзей, ходят с ними в школу. Вместе ездят на экскурсии. Через год, вероятно, в США поедут минские ребята.

РИА.

Слушали. Постановили?

25 ноября Верховный Совет Беларуси посетила, пожалуй, самая высокопоставленная за время его существования делегация — Европарламента.

Кроме ознакомительных встреч с руководством республики и народными депутатами, как сообщает БелаПАН, европарламентарии повидались также с представителями наших партий и движений (коммунистами, социал-демократами, народнофронтовцами, объединенными демократами и т. д.), узнали их мнение о новом союзном договоре, о будущем Беларуси. Гости воздержались от каких бы то ни было оценок сложившейся ситуации. Больше слушали...

То на то и выходит

По данным департамента статистики Литвы, доходы средней семьи республики достигли почти 1500 рублей.

Из этой суммы почти 80 процентов составляет заработная плата, остальное — пособия, различные доплаты. В целом бюджет семьи в этом году вырос почти в два раза, но примерно во столько же повысились и расходы. В основном на продовольствие. Большую часть продуктов и промышленных товаров жители Литвы покупают на рынке.

Вкратце

✦ В течение ближайших двух месяцев Украина выпустит свои временные деньги-купоны, которые будут в обращении в республике примерно полгода. Затем будет введена собственная денежная единица. Об этом заявил заместитель председателя правления Государственного банка Украины Александр Савченко.

✦ Сенат конгресса США одобрил советско-американское торговое соглашение и предоставление СССР статуса наибольшего благоприятствования в торговле с Соединенными Штатами.

✦ В течение декабря парламент Японии рассмотрит вопрос об отсрочке Советскому Союзу части выплат по кредитам, ранее полученным Москвой от Токио, сообщает газета «Асахи».

✦ В связи с резким обострением ситуации вокруг Нагорного Карабаха и в отношениях между Азербайджаном и Арменией Госсовет предложил президентам Азербайджана и Армении прибыть сегодня в Москву, чтобы с их участием обсудить положение и наметить меры, необходимые для предотвращения эскалации конфликта.

✦ Относительно тихо было вчера в кризисных районах Хорватии после вступления в силу заключенного в конце прошлой недели в Женеве соглашения о перемирии между югославской армией и хорватскими формированиями.

Тихой сапой

Уникальный пример приватизации показал Заводской райпищеторг Белорусской столицы.

Тихо-мирно он продал за 250 тысяч рублей здание старенького магазина. Как утверждают специалисты, остаточная стоимость этого «торгового барака» всего около 7 тысяч рублей. Но суть в другом. Коммерческая операция была проделана в тайне от райисполкома и городских властей, то есть собственников.

Пока новый владелец — производственно - коммерческая фирма «ЛАД» — интенсивно проводит в магазине ремонт, горисполком передал в прокуратуру «материалы по незаконной приватизации»...

Виктор АНАТОЛЬЕВ.

Пресс-досье

Президент СССР Михаил Горбачев предложил установить контроль союзных войск на армяно-азербайджанской границе в зоне 5 километров с обеих сторон. Создание подобного «буфера», по мнению Горбачева, поможет уменьшить вероятность открытых столкновений между двумя республиками, находящимися на грани войны.

***

Сенсационное сообщение в американском журнале «Форбс» о намерении советского правительства продать с аукциона тело Ленина, как известно, вызвало бурю негодования у руководства СССР.

Впрочем, такая реакция на откровенную ложь неудивительна. Удивляет другой факт. В том же номере «Форбс» сообщал, что московская корпорация «Читэк» собирается предложить международному рынку ядерные взрывные устройства, приспособленные для мирных целей. Реакции на эту информацию со стороны советских властей не последовало...

(По сообщению радио «Свобода»).

Есть разгуляться где на воле

«На обезлюдевших полях Нечерноземья, — заявил в интервью журналистам Борис Ельцин, — мы ждем увольняемых в запас воинов».

Всем, кто хочет заняться фермерством, земля будет выделена, по словам президента, без ограничения.



Рисунок Олега ПОПОВА.

«Горячий» телефон 32-24-02 работает ежедневно с 9 до 11 часов.

Ракурс

Боль, памяць і адзінота...



Дзень, ноч, дзень... Хутка бяжыць час, мы спяшаемся за жыццём, спрабуем неяк яго планаваць, імкнёмся да сваёй мэты. І зусім не заўважаем, што побач жывуць людзі, для якіх час спыніўся. Для многіх маці спыніўся ён у тое імгненне, калі яны даведаліся пра смерць сваіх сыноў.

Безумоўна, сёння, калі кожны спадзяецца выжыць паасобку, шмат каму не да ўспамінаў пра Афганістан. Але хто абавязаны паклапаціцца аб жанчынах, чыіх дзяцей кіраўніцтва былога Саюза адправіла на смерць?

Фота Сяргея БРУШКО.

Тревожная почта

Нет ни тени надежды

Если позволите, я хочу несколько слов сказать о Заявлении правительства Республики Беларусь 19 ноября с. г., опубликованном в вашей газете.

Во-первых, наше правительство верно «своему выбору». Оно постоянно обращается с заявлениями к своему народу. Уже сбилась со счета: сколько было таких заявлений в этом году. А воз и ныне там. Но снова и снова из заявления в заявление обращается наше внимание на «...нападки и обвинения в адрес правительства со стороны отдельных общественно-политических сил. Особенно усердствует оппозиция БНФ в Верховном Совете республики...» Так и хочется сказать: ну сколько же можно свою бездеятельность и некомпетентность сваливать на народных депутатов от оппозиции БНФ! Нет, уважаемое правительство, многие люди Беларуси уже не те, кто верил вам безраздельно. Мы видим, кто и чего хочет. Признайте, наконец, что вы тормозите процессы, не хотите реформам давать зеленый свет. То, что вы сегодня ставите себе в заслугу, к примеру выделение земли для людей, это вас заставила жизнь. Еще год назад о частной собственности на землю вы не хотели даже и слушать. А вот «отдельные общественно-политические силы» давно вам говорили об этом и многом другом, к чему вы до сих пор не прислушиваетесь.

Вот вы в своем заявлении говорите: «...нагло орудует мафия...» Странно это слышать из уст правительства с его огромным аппаратом милиции, КГБ, под носом у которого орудует мафия, а оно такое заявляет народу. Так позвольте же спросить у такого правительства: вы управляете процессами в республике или вами управляют? Скажите, где, в какой стране услышишь такие заявления? Или как понимать: «Любые попытки правительства навести порядок встречают яростное сопротивление со стороны деляг и их адвокатов...» Да вы никогда не наведете порядок, ибо ваши же министры и их заместители, как уже не раз сообщалось в прессе, являются «теневиками». Чего обращаться к народу? Решайте сами, тут народ надеется на вас, руководителей правительства. Хотя куда уже дальше надеяться.

Анна РАДЮК.

г. Минск

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Аб сацыяльнай абароне інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь

Кожны інвалід, які не ў стане задаволіць свае жыццёвыя патрэбнасці ўласнымі сіламі, мае права на гарантаваную дапамогу з боку дзяржавы.

Гэты Закон вызначае дзяржаўную палітыку Рэспублікі Беларусь у адносінах да інвалідаў і мае на мэце ажыццяўленне эфектыўных мер па папярэджанню інваліднасці, іх рэабілітацыі, забеспячэнні роўнасці і паўнапраўнага ўдзелу ў жыцці грамадства.

Дзяржаўныя органы Рэспублікі Беларусь забяспечваюць атрыманне інвалідамі адукацыі, прафесіянальнай падрыхтоўкі і іх працаўладкаванне.

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. Асновы прававога стану інвалідаў

Інваліды ў Рэспубліцы Беларусь валодаюць усёй паўнатой сацыяльна-эканамічных і асабістых правоў і свабод, замацаваных у Дэкларацыі аб правах інвалідаў, прынятай Генеральнай Асамблеяй ААН, Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, гэтым Законе і іншых заканадаўчых актах.

Інваліды маюць неад'емнае права на павагу іх чалавечай годнасці.

Дыскрымінацыя інвалідаў забараняецца і праследуецца па закону.

Артыкул 2. Вызначэнне паняцця «інвалід»

Інвалідам прызнаецца асоба, якая ў сувязі з абмежаваннем жыццядзейнасці ў выніку наяўнасці фізічных або разумовых недахопаў мае патрэбу ў сацыяльнай дапамозе і абароне.

Абмежаванне жыццядзейнасці асобы выражаецца ў поўнай або частковай страце ёю здольнасці або магчымасці ажыццяўляць самаабслугоўванне, перамяшчэнне, арыентацыю, зносіны, кантроль за сваімі паводзінамі, а таксама займацца працоўнай дзейнасцю.

Артыкул 3. Заканадаўства аб сацыяльнай абароне інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь

Заканадаўства аб сацыяльнай абароне інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь складаецца з гэтага Закона і іншых актаў заканадаўства, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, рашэнняў мясцовых Саветаў, што прымаюцца на іх аснове.

Калі адпаведнымі міжнароднымі дагаворамі ўстаноўлены іншыя правілы, чым тыя, якія прадугледжаны гэтым Законам, то дзейнічаюць нормы міжнароднага права пры ўмове ўдзелу Рэспублікі Беларусь у адпаведным міжнародным дагаворы.

Артыкул 4. Удзел прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый у рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі сацыяльнай абароны інвалідаў

Прадпрыемствы, установы і арганізацыі прымаюць удзел у ажыццяўленні дзяржаўнай палітыкі па праблемах інвалідаў.

Прыбытак прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, які накіроўваецца на вытворчасць тавараў і аказанне паслуг для інвалідаў, а таксама на набыццё абсталявання, утрыманне сацыяльна-культурных аб'ектаў і спартыўных збудаванняў для інвалідаў, вызваляецца ад усіх відаў адлічэнняў у дзяржаўны бюджэт.

Прадпрыемствам, арганізацыям і кааператывам, якія спецыялізуюцца на вытворчасці тэхнічных і іншых сродкаў для інвалідаў, устанаўліваюцца льготы ў парадку і на ўмовах, што вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, а таксама рашэннямі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў.

Артыкул 5. Удзел грамадскіх арганізацый у распрацоўцы і рэалізацыі прынятых рашэнняў па праблемах інвалідаў

Грамадскія арганізацыі ў адпаведнасці са сваімі статутамі прымаюць удзел у вырашэнні праблем, звязаных з сацыяльнай абаронай інвалідаў, а таксама фінансаванні адпаведных мерапрыемстваў.

Дзяржаўныя органы, а таксама прадпрыемствы, установы і арганізацыі незалежна ад форм уласнасці і гаспадарання пры вырашэнні пытанняў, якія закранаюць інтарэсы інвалідаў, прыцягваюць прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый інвалідаў да падрыхтоўкі і прыняцця адпаведных рашэнняў, а таксама іх рэалізацыі.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

Взгляд

Кто хоронит Союз?

В понедельник в Москве члены Госсовета вели битву за Союз. Но все это может оказаться тем, что называется «много шума из ничего». Как и во времена военных кампаний, исход битв нередко решается в штабах полководцев задолго до самих сражений.

На фоне всех этих дебатов — быть или не быть Союзу — как-то незамеченными прошли события, связанные с формированием чрезвычайного бюджета на конец текущего года. Финансовая дыра достигла катастрофических размеров. Теперь в осведомленных кругах поговаривают о долговой перспективе в триллион рублей.

Выход тут может быть только один — эмиссия новых партий бумажных денег. Поэтому Президент Михаил Горбачев и попросил в свое время от Верховного Совета позволения задним числом на пополнение государственного бюджета 30 миллиардами рублей из печатного станка. Дело было направлено сначала в Межреспубликанский экономический комитет, а затем — на рассмотрение Госсовета. И вот неделю назад на своем предыдущем заседании лидеры суверенных республик решали судьбу чрезвычайного бюджета. Члены Госсовета пришли к согласию. За одним исключением. Председатель МЭКа Силаев, попав под перекрестный обстрел на заседании союзного парламента, первым признал, что этим исключением является Россия.

Таким образом, Россия обрекла чрезвычайный бюджет на верную погибель. Финансы — это нерв любого государства, когда нерв защемлен, наступает прогрессирующий паралич. Что значит неучастие России в формировании чрезвычайного бюджета на четвертый квартал текущего года? Это значит окончательный распад того, что еще осталось от Союза. В первую очередь единых Вооруженных Сил. Потому что и здесь действует верный принцип — кто платит, тот и заказывает армию. Во-вторых, своими последними решениями Россия — хочет она того или нет — ставит на колени другие республики, членов Экономического союза. Будем называть вещи своими именами — на всей территории Экономического союза Россия устанавливает свой финансовый диктат. Когда говорят финансы, узы дружбы молчат. Российское руководство одним росчерком пера превратило в национальную собственность ценности Гохрана, предприятия Гознака, а также перевела под свою юрисдикцию бывший Минфин Союза. Все эти акции Россия провела в одностороннем порядке, не ставя в известность своих партнеров. По праву сильного и в нарушение элементарных союзнических обязательств. В-третьих, монополия России на печатный станок приводит к тому, что рубль перестает функционировать как единая союзная валюта, он становится национальной валютой России. И покуда рубль будет оставаться рублем для всех, сама Россия будет выполнять роль дядюшки-опекуна, который будет выдавать деньги своим несмышленым родственникам - республикам. И вместо казанских сирот в этом Союзе появятся сироты минские, ташкентские и т. д.

Обвинить Россию в злонамеренности трудно. Она всего лишь преследует собственные национальные интересы. Печатный станок ей нужен для того, чтобы как можно эффективнее обезболить операции по введению рынка, самортизировать либерализацию цен повышением уровня заработной платы и пенсионного обеспечения. То, что мы в Беларуси себе не сможем позволить. Более того, рублевые потоки устремятся из России к нам, унося с собой все то, что еще не вымели другие республики. Своими шагами, исполненными в духе национального эгоизма, Россия оставляет нас без выбора — только введение национальной валюты и формирование экономических отношений на двусторонней основе. Пора об этом нашим политикам заявить во всеуслышание. В нынешних обстоятельствах просоюзная позиция будет восприниматься как признак слабости и самоунижения. Мы же не должны себе позволить выглядеть слабыми.

Анатолий МАЙСЕНЯ.

Шаноўныя чытачы!

Як вы ведаеце, «Народная газета» павінна выходзіць 250 разоў на год. Менавіта на такую перыядычнасць разлічваюцца рэсурсы паперы, іншыя планавыя паказчыкі выдання. Нягледзячы на вялікія цяжкасці з той самай паперай і яшчэ шмат чым — самі ведаеце, якія цяпер часы, — рэдакцыя імкнецца сумленна выконваць свае абавязацельствы перад вамі. Як і абяцалі, мы выпусцілі цэлы шэраг нумароў з бясплатнымі для падпісчыкаў укладышамі, дзе друкаваліся пераважна афіцыяльныя матэрыялы, заканадаўчыя акты Вярхоўнага Савета, якія, мы ведаем, шмат каго цікавяць.

Але няцяжка падлічыць, што, выпускаючы газету ў звычайным рытме — пяць разоў на тыдзень, — мы датэрмінова вычарпаем гадавы ліміт нумароў. Таму да канца года намечана некалькі планавых нявыхадаў газеты. Адзін з іх — заўтра. Гэта значыць, што наступны нумар «Народнай» вы атрымаеце ў пятніцу, 29 лістапада. Мы ж пастараемся, каб у кожным з нашых «лімітаваных» нумароў было як мага больш цікавых публікацый на розны густ.

Таможня

✦ **ЛИОЗНО**

В ноябре в д. Колышки Лиозненского района оперативной группой ОБЭП УВД Витебского облисполкома задержана автомашина УРАЛ-4320 без номерных знаков, управляемая водителем В. Карпенко, работающим в НПВО «Спецполитехника» (г. Загорск Московской обл.). Он пытался вывезти без соответствующего разрешения за пределы республики 350 армейских полушубков на сумму 294 тыс. рублей. Полушубки получены в войсковой части г. Витебска по наряду КБВО. Груз конфискован, В. Карпенко оштрафован на 10 тыс. рублей.

✦ **ТОЛОЧИН**

Заведующая магазином «Хозтовары» в д. Славное Толочинского района А. Ткачева при доставке товаров в магазин в пути следования продала двухспальную кровать стоимостью 205 рублей и деревообрабатывающий станок стоимостью 300 рублей. Она оштрафована нарсудом на 500 рублей.

По сводкам МВД Республики Беларусь.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

АБ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЕ ІНВАЛІДАЎ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Артыкул 6. Рэспубліканскі міжведамасны савет па праблемах інвалідаў

Для каардынацыі палітыкі ў адносінах праблем інваліднасці і выпрацоўкі ўзгодненых дзеянняў, накіраваных на забеспячэнне выканання палажэнняў гэтага Закона, Урадам рэспублікі ўтвараецца Рэспубліканскі міжведамасны савет па праблемах інвалідаў. Склад савета фарміруецца з першых асоб міністэрстваў і ведамстваў, якія займаюцца пытаннямі сацыяльнага забеспячэння, аховы здароўя, занятасці, транспарту, сувязі, жыллёвага будаўніцтва, адукацыі, культуры і планавання; арганізацый інвалідаў і іншых няўрадавых арганізацый.

Узначальвае савет Першы намеснік Старшыні Савета Міністраў рэспублікі.

Для забеспячэння дзейнасці савета за кошт адпаведных структур Савета Міністраў ствараецца пастаянна дзеючая рабочая група.

Палажэнне аб савеце і яго персанальны склад зацвярджаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 7. Абарона правоў, свабод і законных інтарэсаў інвалідаў

Абарона правоў, свабод і законных інтарэсаў інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь забяспечваецца дзяржавай у судовым або іншым парадку, устаноўленым законам.

Грамадзянін рэспублікі мае права ў судовым парадку аспрэчваць рашэнне ўпаўнаважанага дзяржаўнага органа аб прызнанні або непрызнанні яго інвалідам.

Службовыя асобы і іншыя грамадзяне, вінаватыя ў парушэнні правоў, свабод і законных інтарэсаў інвалідаў, нясуць устаноўленую законам адказнасць.

II. ПРАФІЛАКТЫКА І МЕДЫЦЫНСКАЯ РЭАБІЛІТАЦЫЯ ІНВАЛІДНАСЦІ

Артыкул 8. Прафілактыка інваліднасці

Прафілактыка інваліднасці ўключае ў сябе комплекс мер, накіраваных на папярэджанне спадчынных захворванняў, забеспячэнне здаровага спосабу жыцця насельніцтва, экалагічнай бяспекі, бясшкодных умоў працы, рацыянальнага харчавання, своечасовага лячэння хворых.

Сістэму мер па прафілактыцы інваліднасці распрацоўваюць рэспубліканскія органы аховы здароўя, а ажыццяўляюць прадпрыемствы, установы, арганізацыі і органы аховы здароўя.

Артыкул 9. Забеспячэнне прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі бяспечных умоў працы грамадзянам, якія на іх працуюць

Прадпрыемствы, установы і арганізацыі незалежна ад форм уласнасці і гаспадарання забяспечваюць для ўсіх грамадзян, якія на іх працуюць, бяспечныя ўмовы працы і нясуць ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку адказнасць за зніжэнне працаздольнасці і ўрон, нанесены іх здароўю, пакрываюць расходы на лячэнне і рэабілітацыю.

Работніку, атрымаўшаму інваліднасць па віне ўласніка прадпрыемства, установы, арганізацыі, урон ва ўсіх выпадках пакрываецца поўнасцю, уключаючы шкоду, якая выяўляецца ў прычыненні маральных ці фізічных пакут.

Артыкул 10. Медыцынская рэабілітацыя

Медыцынская рэабілітацыя — сістэма мер, накіраваных на лячэнне розных захворванняў, траўм, фізічных, разумовых і іншых дэфектаў з мэтай прадухілення абвастрэння або абцяжарвання захворвання і наступлення парушэнняў, якія прыводзяць да інваліднасці.

Медыцынская рэабілітацыя ажыццяўляецца праз медыка-санітарную дапамогу, якая арганізуецца органамі аховы здароўя па месцы жыхарства і работы грамадзян.

Артыкул 11. Медыка-прафесіянальная рэабілітацыя

Медыка-прафесіянальная рэабілітацыя накіравана на аднаўленне зніжаных або страчаных прафесіянальна значных функцый, падбор прафесіі і адаптацыю да яе і мае на мэце зрабіць магчымым вяртанне інваліда да працоўнай дзейнасці ў ранейшай або новай прафесіі.

Правядзенне медыка-прафесіянальнай рэабілітацыі адпаведнымі органамі абавязковае для інваліда, калі яно прадугледжана індывідуальнай праграмай рэабілітацыі.

Артыкул 12. Прызнанне асобы інвалідам

Прызнанне асобы інвалідам ажыццяўляецца шляхам экспертнага абследавання яго ў медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі (МРЭК) і вынясення адпаведнага заключэння.

Палажэнне аб МРЭК і інструкцыя па вызначэнню групы і прычыны інваліднасці зацвярджаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Заключэнне медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі з'яўляецца афіцыяльным дакументам, які засведчвае групу і прычыну інваліднасці, а таксама індывідуальную праграму рэабілітацыі.

Інваліду выдаецца пасведчанне. Форма пасведчання зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь па ўзгадненню з грамадскімі арганізацыямі інвалідаў.

Артыкул 13. Індывідуальная праграма рэабілітацыі інваліда

Медыцынская, прафесіянальная і сацыяльная рэабілітацыя інвалідаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з індывідуальнай праграмай рэабілітацыі, якая вызначаецца на аснове заключэння медыка-сацыяльнай экспертызы дзяржаўнымі органамі з удзелам прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый інвалідаў.

Індывідуальная праграма рэабілітацыі інваліда вызначае канкрэтныя аб'ёмы, віды і тэрміны правядзення рэабілітацыйных мер, а таксама віды сацыяльнай дапамогі.

Індывідуальная праграма рэабілітацыі з'яўляецца дакументам, абавязковым для выканання адпаведнымі дзяржаўнымі органамі, а таксама прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі незалежна ад форм уласнасці і гаспадарання.

Артыкул 14. Сістэма органаў медыка-прафесіянальнай рэабілітацыі

У адзіную сістэму органаў медыка-прафесіянальнай рэабілітацыі інвалідаў уваходзяць рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр рэабілітацыі інвалідаў, абласныя, гарадскія спецыялізаваныя цэнтры медыка-прафесіянальнай рэабілітацыі інвалідаў, міжраённыя, раённыя і спецыялізаваныя медыка-рэабілітацыйныя экспертныя камісіі.

Органы медыка-прафесіянальнай рэабілітацыі знаходзяцца ў веданні органаў аховы здароўя рэспублікі.

Артыкул 15. Медыцынскае абслугоўванне інвалідаў

Інвалідам гарантуецца кваліфікаваная бясплатная медыцынская дапамога за кошт сродкаў бюджэту ў дзяржаўных медыцынскіх установах.

Інваліды 1-й і 2-й груп і дзеці-інваліды забяспечваюцца лякарствамі па рэцэптах лечачых урачоў з 90-працэнтнай скідкай, а інваліды 3-й групы — са скідкай пяцідзесяці працэнтаў ад іх кошту, калі яны не карыстаюцца правам на атрыманне лякарстваў на больш ільготных умовах.

Інваліды маюць права на пераважнае абслугоўванне ў амбулаторна-паліклінічных установах і аптэках, а таксама на першачарговае забеспячэнне санаторна-курортным лячэннем у парадку, які ўстанаўліваецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

III. ВЫХАВАННЕ, АДУКАЦЫЯ І ПРАФЕСІЯНАЛЬНАЯ ПАДРЫХТОЎКА ІНВАЛІДАЎ

Артыкул 16. Забеспячэнне інвалідам умоў для атрымання адукацыі і прафесіянальнай падрыхтоўкі

Дзяржава гарантуе інвалідам неабходныя ўмовы для атрымання адукацыі і прафесіянальнай падрыхтоўкі.

Органы адукацыі сумесна з органамі сацыяльнага забеспячэння і аховы здароўя забяспечваюць дашкольнае і пазашкольнае выхаванне дзяцей-інвалідаў, атрыманне інвалідамі сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі ў адпаведнасці з індывідуальнай праграмай рэабілітацыі.

Адукацыя і прафесіянальная падрыхтоўка інвалідаў ажыццяўляюцца ў розных формах, уключаючы навучанне дома і па індывідуальных вучэбных планах.

Дзяржава забяспечвае падрыхтоўку педагагічных кадраў спецыяльна для навучання і прафесіянальнай падрыхтоўкі інвалідаў.

Артыкул 17. Дашкольнае выхаванне дзяцей-інвалідаў

У мэтах стварэння найбольш спрыяльных магчымасцей для выхавання дзяцей-інвалідаў дашкольнага ўзросту і аказання ім неабходнай рэабілітацыйнай дапамогі ў дзіцячых дашкольных установах агульнага тыпу ствараюцца ўмовы для знаходжання ў іх дзяцей-інвалідаў.

Для дзяцей-інвалідаў, стан здароўя якіх выключае магчымасць іх знаходжання ў дашкольных установах агульнага тыпу, ствараюцца спецыяльныя дашкольныя ўстановы.

Артыкул 18. Выхаванне і навучанне дзяцей-інвалідаў дома

У выпадку, калі адсутнічае магчымасць ажыццяўляць выхаванне і навучанне дзяцей-інвалідаў у агульных або спецыяльных дашкольных установах і навучальных установах, то па жаданню бацькоў выхаванне і навучанне іх праводзіцца дома. Пры гэтым аднаму з бацькоў або асобе, якая іх замяняе, прадастаўляюцца матэрыяльнае забеспячэнне і льготы ў парадку і на ўмовах, якія вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Час догляду за такім інвалідам залічваецца ў працоўны стаж.

Адпаведныя навучальна-выхаваўчыя ўстановы аказваюць дапамогу бацькам у навучанні дзяцей-інвалідаў дома.

Артыкул 19. Пазашкольнае выхаванне дзяцей-інвалідаў

У мэтах усебаковага і гарманічнага развіцця дзяцей-інвалідаў, выхавання ў іх грамадскай актыўнасці, інтарэсу да працы, далучэння да навукі, тэхнікі, мастацтва і спорту органы адукацыі, іншыя дзяржаўныя органы абавязаны забяспечваць даступнасць пазашкольнага выхавання дзецям-інвалідам, ствараючы для гэтага неабходныя ўмовы.

Артыкул 20. Сярэдняя, сярэдняя спецыяльная і вышэйшая адукацыя інвалідаў

Сярэдняя, сярэдняя спецыяльная і вышэйшая адукацыя інвалідаў ажыццяўляецца ў навучальных установах агульнага тыпу, а пры неабходнасці — у спецыяльных навучальных установах.

Вучэбныя заняткі арганізуюцца таксама для дзяцей-інвалідаў, якія праходзяць курс лячэння ў стацыянарных лячэбна-прафілактычных або рэабілітацыйных установах.

Інваліды, у выпадку станоўчай здачы ўступных экзаменаў, пры іншых роўных умовах, маюць пераважнае права на залічэнне ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы.

Паспяваючым інвалідам стацыянарнай формы навучання выплачваецца стыпендыя незалежна ад атрымліваемай пенсіі, дапамогі.

Дзяржава садзейнічае ў працаўладкаванні маладых спецыялістаў-інвалідаў.

Артыкул 21. Выхаванне і навучанне дзяцей-інвалідаў у стацыянарных установах

Дзецям-інвалідам, якія пастаянна знаходзяцца ў стацыянарных установах, забяспечваецца гэтымі ўстановамі бесперапыннасць выхавання і адукацыі ў арганічнай сувязі з сацыяльна-бытавой і працоўнай адаптацыяй.

Артыкул 22. Прафесіянальная падрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі інвалідаў

Прафесіянальная падрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі інвалідаў забяспечваюцца ў навучальных установах, на прадпрыемствах і ў арганізацыях (спецыялізаваных або агульнага тыпу) сумесна з установамі сацыяльнай дапамогі ў адпаведнасці з індывідуальнай праграмай рэабілітацыі.

Матэрыяльнае забеспячэнне інвалідаў у перыяд прафесіянальнай падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі ажыццяўляецца ў парадку і на ўмовах, якія вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 23. Сродкі міжасабовых зносін

Мова жэстаў прызнаецца дзяржавай у якасці сродку міжасабовых зносін, навучання і прадастаўлення паслуг перакладу.

Асобы з дэфектамі зроку забяспечваюцца навучаннем па сістэме Брайля, доступам да аўдыёсродкаў і буйнога шрыфту.

Для асоб з разумовымі недахопамі арганізуецца сістэма навучання лёгкаму разуменню мовы.

Асобам з дэфектамі мовы прадастаўляюцца сучасныя тэхнічныя сродкі зносін.

IV. ГАРАНТЫІ ПРАВОЎ ІНВАЛІДАЎ У СФЕРЫ ПРАЦЫ

Артыкул 24. Спецыяльныя меры па працаўладкаванню інвалідаў

Спецыяльныя меры па працаўладкаванню інвалідаў уключаюць у сябе комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на забеспячэнне працаўладкавання інвалідаў і заканадаўчае замацаванне абавязацельстваў па аказанню фінансавай дапамогі і прадастаўленню льгот прадпрыемствам, установам і арганізацыям (незалежна ад форм уласнасці), якія ствараюць спецыяльныя рабочыя месцы і прымяняюць працу інвалідаў.

Артыкул 25. Рэалізацыя інвалідамі права на працу

У мэтах рэалізацыі творчых і вытворчых здольнасцей інвалідаў з улікам індывідуальных праграм рэабілітацыі ім забяспечваецца права працаваць на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях са звычайнымі ўмовамі працы, на спецыялізаваных прадпрыемствах, у цэхах і на ўчастках, якія выкарыстоўваюць працу інвалідаў, а таксама займацца прадпрымальніцкай і іншай працоўнай дзейнасцю, не забароненай законам.

Адмова ў заключэнні працоўнага дагавора або ў пераводзе па службе, звальненне па ініцыятыве адміністрацыі, перавод інваліда на іншую работу без яго згоды па матывах інваліднасці не дапускаецца, за выключэннем выпадкаў, калі па заключэнню медыкарэабілітацыйнай экспертнай камісіі стан яго здароўя перашкаджае выкананню прафесіянальных абавязкаў або пагражае здароўю і бяспецы працы іншых асоб.

Не дапускаецца звальненне з работы па ініцыятыве адміністрацыі асобы, якая праходзіць медыцынскую, прафесіянальную і сацыяльную рэабілітацыю ў адпаведных установах незалежна ад тэрміну знаходжання ў іх.

Артыкул 26. Органы па працаўладкаванню інвалідаў

Працаўладкаванне інвалідаў забяспечваецца дзяржаўнай службай занятасці і таварыствамі інвалідаў.

Абласныя (Мінскі гарадскі) органы па працаўладкаванню штогод распрацоўваюць праграмы па працаўладкаванню інвалідаў, узаемадзейнічаючы пры гэтым з таварыствамі інвалідаў, органамі сацыяльнага забеспячэння, прафсаюзамі. Да выключнага ведання дзяржаўных службаў занятасці насельніцтва на ўсіх узроўнях адносіцца стварэнне рабочых месцаў для інвалідаў.

Раённыя органы па працаўладкаванню непасрэдна забяспечваюць працаўладкаванне інвалідаў. Іх накіраванне аб прыёме на работу інваліда на спецыяльна створанае або браніруемае рабочае месца абавязковае для прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый незалежна ад форм уласнасці і гаспадарання.

Артыкул 27. Забеспячэнне занятасці інвалідаў

У мэтах забеспячэння занятасці інвалідаў дзяржаўнымі органамі з удзелам грамадскіх арганізацый інвалідаў устанаўліваюцца нарматывы па браніраванню на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях рабочых месцаў для інвалідаў у памеры не менш пяці працэнтаў ад колькасці працуючых (калі колькасць працуючых не менш 20 чалавек).

Парадак устанаўлення нарматываў па браніраванню рабочых месцаў і меры адказнасці прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, уключаючы органы дзяржаўнай улады і кіравання, за невыкананне заданняў па браніраванню рабочых месцаў для інвалідаў вызначаецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 28. Абавязак работадаўцаў па працаўладкаванню асоб, страціўшых працаздольнасць на рабоце

Прадпрыемствы, установы, арганізацыі, кааператывы, калгасы і прыватныя прадпрымальнікі абавязаны выдзяляць або арганізоўваць новыя рабочыя месцы для працаўладкавання тых работнікаў, якія страцілі працаздольнасць у выніку няшчаснага выпадку на дадзенай вытворчасці або атрымалі прафесіянальнае захворванне і ў выніку гэтага прызнаны інвалідамі.

У выпадку невыканання ўказанага патрабавання яны павінны пры скасаванні працоўнага дагавора (кантракта) з гэтым работнікам унесці ў дзяржаўны фонд садзейнічання занятасці ўзнос, роўны 10-кратнай гадавой заработнай плаце дадзенага работніка.

Артыкул 29. Стварэнне спецыялізаваных прадпрыемстваў, цэхаў і ўчасткаў для выкарыстання працы інвалідаў

З улікам патрэбнасцей інвалідаў і мясцовых асаблівасцей адпаведныя органы па працаўладкаванню, а таксама прадпрыемствы і арганізацыі незалежна ад форм уласнасці і гаспадарання ствараюць спецыялізаваныя прадпрыемствы, цэхі і ўчасткі для выкарыстання працы інвалідаў. У гэтым выпадку ім з Дзяржаўнага фонду садзейнічання занятасці пакрываюцца страты за набытае абсталяванне для прыстасавання рабочых месцаў інвалідаў.

Будаўніцтва спецыялізаваных прадпрыемстваў, цэхаў і ўчасткаў для працаўладкавання інвалідаў, якія прадугледжаны праграмамі абласных (Мінскага гарадскога) органаў па працаўладкаванню, абавязковае для прадпрыемстваў, арганізацый і кааператываў.

Артыкул 30. Перавагі і льготы для прадпрыемстваў, якія прымяняюць працу інвалідаў

Прадпрыемствы, установы і арганізацыі, у якіх занята не менш трыццаці працэнтаў інвалідаў ад агульнай колькасці працуючых, карыстаюцца правам на льготнае падаткаабкладанне, фінансаванне і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне.

Калі інваліды складаюць не менш пяцідзесяці працэнтаў ад агульнай колькасці працуючых (без уліку працуючых па сумяшчальніцтву), прадпрыемствы, установы і арганізацыі вызваляюцца ад падатку на прыбытак.

Парадак і ўмовы льготнага падаткаабкладання, фінансавання і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, якія прымяняюць і забяспечваюць працу інвалідаў, устанаўліваюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 31. Умовы працы інвалідаў

Інвалідам, занятым на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях, ствараюцца неабходныя ўмовы працы ў адпаведнасці з індывідуальнай праграмай рэабілітацыі.

Умовы працы, у тым ліку аплата працы, рэжым рабочага часу і часу адпачынку, працягласць штогадовага і дадатковага водпускаў, якія ўстанаўліваюцца ў калектыўным або індывідуальным працоўным дагаворы, не могуць пагаршаць становішча або абмяжоўваць правы інвалідаў у параўнанні з іншымі работнікамі.

Адміністрацыя прадпрыемстваў, арганізацый мае права памяншаць інвалідам нормы выпрацоўкі ў залежнасці ад стану іх здароўя.

Прыцягненне інвалідаў да звышурочных работ, работы ў выхадныя дні і начны час дапускаецца толькі з іх згоды і пры ўмове, калі такія работы не забаронены ім медыцынскімі рэкамендацыямі.

Інвалідам прадастаўляецца штогадовы водпуск не менш аднаго каляндарнага месяца.

Для інвалідаў 1-й і 2-й груп устанаўліваецца скарочаная працягласць рабочага часу не больш 36 гадзін у тыдзень.

Інвалідам пры прыёме на работу не ўстанаўліваецца выпрабавальны тэрмін. Пры скарачэнні колькасці або штату работнікаў інваліды пры роўнай прадукцыйнасці працы і кваліфікацыі маюць пераважнае права пакідання на рабоце.

Артыкул 32. Надомная праца і прадпрымальніцкая дзейнасць інвалідаў

Саветы народных дэпутатаў ствараюць неабходныя ўмовы для арганізацыі надомнай працы і прадпрымальніцкай дзейнасці інвалідаў шляхам прадастаўлення нежылых памяшканняў для ўказанай дзейнасці, а таксама ў набыцці сыравіны і збыце прадукцыі.

V. СТВАРЭННЕ ЎМОЎ ДЛЯ БЕСПЕРАШКОДНАГА ДОСТУПУ ІНВАЛІДАЎ ДА САЦЫЯЛЬНАЙ ІНФРАСТРУКТУРЫ

Артыкул 33. Дзяржаўная палітыка ў адносінах да аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры

Органы дзяржаўнай улады і кіравання Рэспублікі Беларусь, прадпрыемствы і арганізацыі (незалежна ад форм уласнасці) забяспечваюць інвалідам неабходныя ўмовы для свабоднага доступу да аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры, жылых, грамадскіх, вытворчых будынкаў і збудаванняў, бесперашкоднага карыстання грамадскім транспартам і транспартнымі камунікацыямі, сродкамі сувязі і інфармацыі, месцамі адпачынку і вольнага часу.

Кантроль за рэалізацыяй указаных мерапрыемстваў ажыццяўляе Рэспубліканскі міжведамасны савет па праблемах інвалідаў.

Артыкул 34. Улік патрэбнасцей інвалідаў пры праектаванні і будаўніцтве аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры

Праектаванне і забудова населеных пунктаў, фарміраванне жылых раёнаў, распрацоўка праектных рашэнняў, будаўніцтва і рэканструкцыя будынкаў, збудаванняў, уключаючы аэрапорты, чыгуначныя вакзалы, рачныя порты, комплексы і камунікацыі, а таксама распрацоўка і выраб транспартных сродкаў, у тым ліку індывідуальных, сродкаў сувязі і інфармацыі без прыстасавання гэтых аб'ектаў і сродкаў для доступу і выкарыстання інвалідамі не дапускаюцца.

Артыкул 35. Прыстасаванне дзеючых аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры для выкарыстання інвалідамі

Дзеючыя сродкі транспарту, сувязі і інфармацыі і іншыя аб'екты сацыяльнай інфраструктуры павінны быць прыстасаваны для доступу і выкарыстання інвалідамі ў парадку і на ўмовах, якія вызначаюцца адпаведнымі органамі дзяржаўнай улады і кіравання з удзелам грамадскіх арганізацый інвалідаў.

У тых выпадках, калі ўказаныя аб'екты немагчыма прыстасаваць для доступу інвалідаў, адпаведнымі прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі павінны быць распрацаваны і ажыццёўлены неабходныя меры, якія б забяспечвалі задавальненне патрэбнасцей інвалідаў.

Артыкул 36. Прыстасаванне жылых памяшканняў для доступу і карыстання інвалідамі

Жылыя памяшканні, якія займаюць інваліды або сем'і, што маюць у сваім складзе інваліда, павінны быць абсталяваны спецыяльнымі сродкамі і прыстасаваннямі ў адпаведнасці з індывідуальнай праграмай рэабілітацыі інвалідаў.

Абсталяванне ўказаных жылых памяшканняў ажыццяўляецца мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў, прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі, у веданні якіх знаходзіцца жыллёвы фонд. Абсталяванне індывідуальных жылых дамоў праводзіцца ў парадку, які вызначаецца адпаведнымі Саветамі народных дэпутатаў, з удзелам грамадскіх арганізацый інвалідаў.

Фінансаванне ўказаных мерапрыемстваў ажыццяўляецца за кошт сродкаў, якія выдзяляюцца на бягучы і капітальны рамонт жыллёвага фонду. На гэтыя мэты таксама могуць накіроўвацца сродкі грамадскіх дабрачынных арганізацый.

Артыкул 37. Прыстасаванне транспартных сродкаў і маршрутаў для карыстання інвалідамі

Адпаведныя міністэрствы і ведамствы распрацоўваюць асноўныя прынцыпы і дадатковыя патрабаванні па рэалізацыі праграмы выраб і пераабсталявання транспартных сродкаў для карыстання інвалідамі.

У праграмах павінны быць прадугледжаны:

— тэрміны для пераабсталявання ключавых чыгуначных, аўтобусных станцый, рачных партоў, аэрапартаў, якія павінны быць даступныя для інвалідаў;

— спецыяльныя прыстасаванні для транспартных сродкаў, якія перавозяць інвалідаў, у тым ліку і з інвалíднымі каляскамі;

— спецыяльныя маршруты з зададзеным графікам руху;

— прыпынкі транспартных сродкаў па патрабаванню інвалідаў.

Артыкул 38. Забеспячэнне інвалідам доступу ў культурна-відовішчныя ўстановы і спартыўныя збудаванні

Мясцовыя органы дзяржаўнай улады і кіравання абавязаны забяспечваць інвалідам неабходныя ўмовы для свабоднага доступу і карыстання культурна-відовішчнымі ўстановамі і спартыўнымі збудаваннямі для заняткаў фізічнай культурай і спортам, а таксама забяспечваць прадастаўленне спецыяльнага спартыўнага інвентару.

Інваліды карыстаюцца пералічанымі паслугамі бясплатна або на льготных умовах у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 39. Забеспячэнне інвалідаў сродкамі сувязі

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусь забяспечвае неабходныя ўмовы для ўкаранення спецыяльных сродкаў тэлекамунікацыйнага абслугоўвання інвалідаў і спецыяльнымі тэлефоннымі апаратамі для абанентаў з дэфектамі слыху перагаворныя пункты калектыўнага карыстання.

Інваліды 1-й і 2-й груп маюць права на бясплатную або льготную ўстаноўку без чаргі тэлефонаў, уключаючы спецыяльныя, на ўмовах і ў парадку, устаноўленых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

VI. САЦЫЯЛЬНАЯ ДАПАМОГА ІНВАЛІДАМ

Артыкул 40. Віды сацыяльнай дапамогі інвалідам

Інвалідам гарантавана сацыяльная дапамога з боку дзяржавы ў выглядзе грашовых выплат (пенсіі, дапамогі, аднаразовыя выплаты), забеспячэнне тэхнічнымі і іншымі сродкамі, уключаючы аўтамабілі, крэслы-каляскі, пратэзна-артапедычныя вырабы, друкаваныя выданні са спецыяльным шрыфтам, гукаўзмацняльную апаратуру і сігналізатары, а таксама шляхам аказання паслуг па медыцынскай, сацыяльнай, прафесіянальнай рэабілітацыі і бытавому абслугоўванню.

Парадак забеспячэння інвалідаў пенсіямі і дапамогамі вызначаецца заканадаўствам аб пенсіённым і сацыяльным забеспячэнні.

Асобы, якія сталі інвалідамі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС, разам з правамі, прадастаўленымі гэтым Законам, карыстаюцца льготамі і кампенсацыямі, устаноўленымі законамі Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» і СССР «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых у выніку Чарнобыльскай катастрофы».

Артыкул 41. Прадастаўленне інваліду тэхнічнага або іншага сродку

Тэхнічны або іншы сродак прадастаўляецца інваліду ў адпаведнасці з індывідуальнай праграмай рэабілітацыі бясплатна або на льготных умовах.

У выпадку непрадастаўлення інваліду тэхнічнага або іншых сродкаў, прадугледжаных праграмай рэабілітацыі, яму выплачваецца кампенсацыя ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Інвалідам, якія атрымалі ў адпаведнасці з індывідуальнай праграмай рэабілітацыі транспартныя сродкі бясплатна або на льготных умовах выплачваецца кампенсацыя на тэхнічнае абслугоўванне і рамонт гэтых сродкаў у парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 42. Транспартнае абслугоўванне інвалідаў

Інваліды карыстаюцца ў рэспубліцы правам бясплатнага праезду на ўсіх відах гарадскога і прыгараднага пасажырскага транспарту, акрамя таксі.

Інвалідам прадастаўляецца пяцідзесяціпрацэнтная скідка з кошту праезду на ўнутраных лініях паветранага, чыгуначнага, рачнога і аўтамабільнага транспарту з 1 кастрычніка па 15 мая і адзін раз у астатні час года.

Указаныя льготы распаўсюджваюцца на асобу, якая суправаджае інваліда 1-й групы, а таксама дзіця-інваліда.

Артыкул 43. Парадак і ўмовы пратэзавання інвалідаў

Інваліды маюць права на выраб і рамонт усіх відаў пратэзных вырабаў (акрамя зубных пратэзаў з каштоўных металаў), за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

Артыкул 44. Жыллёва-бытавое абслугоўванне інвалідаў

Пры размеркаванні жылых памяшканняў выканаўчыя камітэты мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, прадпрыемствы, установы і арганізацыі ўлічваюць патрэбнасці інвалідаў у выдзяленні ім жылых памяшканняў паблізу месца іх работы, месца жыхарства іх сваякоў, устаноў рэабілітацыі.

Інвалідам згодна з медыцынскімі паказаннямі і з улікам іх жадання прадастаўляюцца (або замяняюцца) жылыя памяшканні на ніжніх паверхах жылых дамоў.

Жылыя памяшканні, якія прадастаўляюцца інвалідам, павінны адпавядаць санітарна-тэхнічным патрабаванням, што вызначаюцца ўлікам стану здароўя інвалідаў.

Падставы прызнання інвалідаў маючымі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, чарговасць прадастаўлення ім жылля вызначаюцца Жыллёвым Кодэксам Рэспублікі Беларусь, пры гэтым інваліды 1-й групы лічацца маючымі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў пры забяспечанасці жылой плошчай па 9 кв. метраў і менш на аднаго члена сям'і.

Інвалідам прадастаўляюцца льготы па аплаце жылля і камунальных паслуг у парадку, які ўстанаўліваецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Інвалідам з парушэннем апорна-рухальнага апарату прадастаўляецца права на будаўніцтва гаража паблізу месца пражывання.

Артыкул 45. Забеспячэнне інвалідаў харчовымі і прамысловымі таварамі

Інваліды маюць права на льготнае забеспячэнне харчовымі і прамысловымі таварамі.

З гэтай мэтай дзяржава стварае спецыяльныя магазіны, секцыі, аддзелы па продажу харчовых і прамысловых тавараў інвалідам, арганізуе сталы заказаў, спецыяльны ўлік для набыцця тавараў павышанага попыту.

Частку харчовых і прамысловых тавараў дзяржава накіроўвае мэтавым назначэннем для продажу інвалідам на льготных умовах.

Мясцовыя Саветы народных дэпутатаў па хадайніцтвах грамадскіх арганізацый інвалідаў аказваюць дапамогу інвалідам у набыцці праз рознічную гандлёвую сетку тавараў гаспадарчага, культурна-бытавога, турысцкага і спартыўнага прызначэння.

Пералік захворванняў інвалідаў, якія маюць права на льготнае абслугоўванне харчовымі і прамысловымі таварамі, зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 46. Надомнае абслугоўванне

Інвалідам, якія маюць патрэбу ў пабочным доглядзе і дапамозе, органамі сацыяльнай дапамогі прадастаўляюцца медыцынскія і бытавыя паслугі дома або ў стацыянарных установах.

Дзяржава садзейнічае развіццю сеткі стацыянарных устаноў сацыяльнай дапамогі інвалідам, якія маюць патрэбу ў пабочным доглядзе.

Артыкул 47. Правы інвалідаў, якія знаходзяцца ў дамах-інтэрнатах і іншых стацыянарных установах сацыяльнай дапамогі

Умовы прабывання інвалідаў у доме-інтэрнаце або іншай стацыянарнай установе сацыяльнай дапамогі забяспечваюць магчымасць рэалізацыі інвалідамі іх правоў і законных інтарэсаў і садзейнічаюць максімальнаму задавальненню патрэбнасцей асобы.

У выпадку, калі ў выніку рэабілітацыйных мер адпала неабходнасць далейшага знаходжання інваліда ў доме-інтэрнаце або іншай стацыянарнай установе сацыяльнай дапамогі, яму прадастаўляецца мясцовым органам дзяржаўнай улады добраўпарадкаваная жылая плошча ў адпаведнасці з патрабаваннямі артыкулаў 36 і 44 гэтага Закона.

Дзеці-інваліды, якія знаходзяцца ў стацыянарных установах і з'яўляюцца сіротамі або пазбаўлены апекі бацькоў, па дасягненні паўналецця атрымліваюць без чаргі жылую плошчу ў адпаведнасці з індывідуальнай праграмай рэабілітацыі

Артыкул 48. Паўнамоцтвы мясцовых органаў улады ў прыняцці рашэнняў, накіраваных на паляпшэнне жыцця інвалідаў.

Мясцовыя Саветы народных дэпутатаў за кошт сродкаў адпаведных бюджэтаў у межах сваіх паўнамоцтваў могуць устанаўліваць даплаты інвалідам да ўсіх відаў дзяржаўных пенсій, ільготы па медыцынскаму абслугоўванню, па аплаце жылой плошчы, камунальных паслуг, па праездзе на грамадскім транспарце, скідкі з кошту індывідуальных сродкаў перамяшчэння, паліва, прадуктаў харчавання, адзення, абутку і іншых неабходных інвалідам тавараў, а таксама прымаць іншыя рашэнні, накіраваныя на задавальненне спецыфічных патрэбнасцей інвалідаў і павышэнне іх жыццёвага ўзроўню.

Артыкул 49. Паўнамоцтвы працоўных калектываў у прыняцці рашэнняў, накіраваных на паляпшэнне ўмоў жыцця інвалідаў

Інваліды, якія працавалі да выхаду на пенсію на прадпрыемстве, ва ўстанове, арганізацыі, захоўваюць права нараўне з яго работнікамі карыстацца наяўнымі магчымасцямі па медыцынскаму абслугоўванню, забеспячэнню жыллём, пуцёўкамі ў аздараўленчыя і прафілактычныя ўстановы, а таксама па рашэнню агульнага сходу (канферэнцыі) калектыву — іншымі сацыяльнымі паслугамі і льготамі.

Прадпрыемствы, установы і арганізацыі незалежна ад форм уласнасці маюць права за кошт уласных сродкаў устанаўліваць надбаўкі і даплаты да пенсій інвалідаў, асабліва адзінокіх, якія маюць патрэбу ў пабочнай дапамозе і доглядзе, а таксама прадастаўляць іншыя льготы, прадугледжаныя гэтым Законам.

Артыкул 50. Крыніцы фінансавання сацыяльнай дапамогі

Сацыяльная дапамога інвалідам прадастаўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, пенсіённага фонду і фонду сацыяльнага страхавання Рэспублікі Беларусь, а таксама рэспубліканскага фонду сацыяльнай абароны інвалідаў, які ўтвараецца за кошт добраахвотных узносаў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, незалежна ад выкарыстоўваемых форм уласнасці і гаспадарання, кааператываў, грамадскіх арганізацый і грамадзян, даходаў ад правядзення тэатральна-відовішчных мерапрыемстваў, латарэй, дабрачыннай дзейнасці і іншых паступленняў.

Прадпрыемствам, установам, арганізацыям, у тым ліку грамадскім, і кааператывам, а таксама асобам, якія займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю, фінансуючым мерапрыемствы, звязаныя з аказаннем сацыяльнай дапамогі інвалідам, прадастаўляюцца льготы па падаткаабкладанню ў парадку і на ўмовах, вызначаемых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь

VII. ГРАМАДСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ ІНВАЛІДАЎ

Артыкул 51. Стварэнне грамадскіх арганізацый інвалідаў

У мэтах абароны сваіх правоў і інтарэсаў, аказання ўзаемнай дапамогі і паслуг, інваліды і асобы, якія іх прадстаўляюць, маюць права ствараць грамадскія арганізацыі, у тым ліку розныя фонды, у парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 52. Дзяржава і грамадскія арганізацыі інвалідаў

Дзяржава забяспечвае захаванне правоў і законных інтарэсаў грамадскіх арганізацый інвалідаў і ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і гэтым Законам гарантуе ўмовы для выканання імі статутных задач, аказвае ім усямерную падтрымку і дапамогу.

Умяшальніцтва дзяржаўных органаў і службовых асоб у дзейнасць грамадскіх арганізацый інвалідаў не дапускаецца, акрамя выпадкаў, калі гэта прадугледжана заканадаўствам.

Пытанні, якія датычацца інтарэсаў грамадскіх арганізацый інвалідаў, у прадугледжаных заканадаўствам выпадках вырашаюцца дзяржаўнымі органамі і гаспадарчымі арганізацыямі з удзелам або па ўзгадненню з адпаведнымі грамадскімі арганізацыямі інвалідаў.

Артыкул 53. Падаткаабкладанне грамадскіх арганізацый інвалідаў

Грамадскія арганізацыі інвалідаў, іх прадпрыемствы, установы і арганізацыі, калі на іх працуе не менш пяцідзесяці працэнтаў інвалідаў ад колькасці прамыслова-вытворчага персаналу, вызваляюцца ад платы падатку на прыбытак і збораў, якія ўносяцца ў дзяржаўны бюджэт.

